# НАЗОЎНІК

**Асноўныя паняцці:** назоўнік, граматычныя катэгорыі (род, лік, склон), сінтаксічная функцыя, лексіка-граматычныя разрады (агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, рэчыўныя, зборныя), тыпы скланення (І, ІІ, ІІІ, рознаскланяльныя, нескланяльныя), асноўныя спосабы ўтварэння.

**1. Прачытайце тэкст. Знайдзіце назоўнікі, вызначце іх лексічнае значэнне і сінтаксічную функцыю.**

Па-над Прыпяццю між лясоў, пяскоў, балот туліцца невялічкая вёсачка, хат, можа, так трыццаць ці сорак. І хаты няроўныя тут, як і людзі: адна большая, другая меншая, старэйшая ці навейшая. Але хата дзеда Талаша ўсё ж такі зварочвае на сябе ўвагу. Не так знадворным выглядам, як адзіноцтвам: стаіць яна наводшыбе і ў блізкім суседстве з хмызняком ускрай балота. Побач з хатай, прыкрываючы яе ад летняга сонца, красуецца высокая разложыстая груша. Вясною, усыпаная белым цветам, як маладая дзяўчына, яна проста аздабляе дзедаў двор, і не толькі дзед Талаш, а і бусел з гнязда, змайстраванага на дзедавай клуні, залюбуецца ёю.

Я. Колас.

**2. Выпішыце з тэксту ўласныя назоўнікі, групуючы іх паводле лексічнага значэння (імёны, прозвішчы, псеўданімы, назвы краін і г. д.). Назавіце граматычныя асаблівасці ўласных назоўнікаў.**

У даўніну, пяць або шэсць стагоддзяў таму назад, падарожнікі і купцы, якім выпадала ехаць праз Беларусь, у сваіх успамінах нярэдка называлі нашу зямлю краінай замкаў і палацаў. Перад іх вачыма амаль праз кожныя 40-50 кіламетраў паўставалі магутныя каменныя ці цагляныя сцены з вузкімі байніцамі, заўсёды гатовыя належным чынам сустрэць варожую сілу. А бараніцца тады нашым продкам даводзілася часта. ...Ад сівой незваротнай мінуўшчыны засталіся скупыя летапісныя радкі, курганы-валатоўкі ды рэшткі колішніх збудаванняў. Руіны замка ў Навагрудку... Руіны замка ў Лідзе... Руіны замка ў Крэве, што ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці... Але ёсць і шчаслівыя выключэнні. Нясвіжскі замак-палац, нягледзячы на шматлікія ваенныя віхуры, стаіць да сённяшніх дзён.

З пачатку XVI стагоддзя Нясвіжам валодалі князі Радзівілы. Многія прадстаўнікі гэтага славутага рода вызначыліся і на ратным полі, і на ніве культуры. Так, адзін з іх, Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка (мянушку яму прыдумаў вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст), здзейсніў паломніцтва ў Іерусалім, пасля чаго напісаў па-лацінску "Перэгрынацыю..." – кнігу падарожных нататкаў, якая шмат разоў перавыдавалася на розных мовах, у тым ліку і па-беларуску. Менавіта Мікалай Крыштоф і запрасіў з Італіі архітэктара Джавані Марыя Бернардоні спраектаваць на месцы колішняга драўлянага замка новы – варты імені і становішча Радзівілаў. Праз некалькі гадоў на правым беразе ракі Ушы паўстала магутная крэпасць.

Паводле У. Ягодўзіка.

**3. Запішыце па пяць назваў беларускіх газет і часопісаў, рэк і азёр, імёнаў і прозвішчаў беларускіх пісьменнікаў, мастакоў і іх асноўных твораў.**

**4. Выпішыце са сказаў канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі. Вызначце іх лексічнае значэнне і граматычныя прыметы.**

1. Трапіш да кабеты рахманай – паспытаеш, друг мой дарагі, дранікі са свежаю смятанай, бабку, клёцкі, нават пірагі (Панч.). 2. Бывае, што чалавек застаецца адзін – і не адчувае адзіноты. Часам яму проста неабходна пабыць аднаму: у хвіліны роздуму, скрухі, болю... (З.П.). 3. Кастусь узяў кош і з радасцю павёў Яську на знаёмыя грыбныя баравіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(С.А.). 4. Рэўнасць... Паспрабуй разбярыся, якое гэта пачуццё – добрае альбо кепскае? (З.П.). 5. Дзеці нейкім сваім дзіцячым пачуццём разбіраюцца ў шчырасці дарослых, у адносінах іх да сябе (Вас.). 6. Дружба дружбаю, а служба службаю (Прык.). 7. Маўчанне, якое панавала ў доме, трохі насцярожвала (Каратк.). 8. ...Вочы просяць нябёсаў тваіх, ім твайго не хапае блакіту (А.К.). 9. Спакойнага шчасця не зычу нікому... (А.К.). 10. Ноч. Цішыня. На вуліцы – ні душы (Гіл.). 11. Тамаш сядзеў у бары і не падаваў ніякага голасу на гуканне жонкі (Бяд.). 12. Дабрыня і пяшчота патрэбны чалавеку як сонца (З.П.). 13. Кароткія змрочныя дні наводзілі паныласць і смутак, прыгняталі добры настрой і адчуванне (К-с).

**У вытворных абстрактных назоўніках вызначце словаўтваральныя суфіксы.**

**5. Выпішыце з верша абстрактныя назоўнікі. Вызначце, якія з іх могуць набываць канкрэтнае значэнне. Утварыце з гэтымі назоўнікамі адпаведныя словазлучэнні і запішыце іх.**

Ісціна, адвечная як свет:
Шчасце ходзіць толькі ў пары з горам.
За надзеяй – боль зняверу ўслед.
За пашанай – прыніжэння сорам.
За святлом знаходкі – горыч страты,
За агнём любві – разлукі снег.
За абдымкамі – падножка здрады ...
Ісціна, адвечная як свет.

Н. Гілевіч.

**6. Выпішыце са сказаў адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі. Вызначце лексічныя і граматычныя прыметы адушаўлёнасці – неадушаўлёнасці. Вылучыце сярод адушаўлёных назоўнікаў асабовыя.**

1. Пятрок іграў доўга, пасля песень узяўся за танцы і перайграў і казачка, і лявоніху (В.Б.). 2. Адным з галоўных багоў нашых продкаў быў Пярун – бог грому і маланкі, дажджу, апякун вайсковай справы і княскай дружыны (І.С.). 3. Сунічнікам акопы зараслі, і ягады чырвоныя паспелі (Грах.). 4. Ты паслухай, ты паслухай, сябрына ўся мая, ты пацешся, беларуская зямля, падзівіцеся, суседка і сусед, -- пра Лявоніху спявае ўвесь свет (Віт.). 5. Трэба, казаў, талаку збіраць, талакою жыць – думаць… (Карам.). 6. Бліжэй да станцыі стаяў двор старога Язэпа, местачковага грамацея (І.Н.). 7. Ай, які спакуслівы пах ад гэтых грачанікаў (Як.). 8. А пчолы з кожнай краскі збіралі мёд дзень цэлы (Я.П.). 9. На этнічнай тэрыторыі Беларусі рассялілася некалькі славянскіх плямёнаў: крывічы, дрыгавічы, радзімічы, валыняне (І.С.). 10. Свой адметны шлях у гісторыі культуры кожнага канкрэтнага народа перадвызначае працягласць эпохі (І.С.). 11. Тут лісічка, зайчык, мышкі, рыбкі, буслік даўгавязы (К-с). 12. Педагог уплывае на вучняў сваімі адносінамі да жыцця, працы, людзей (Віт.).

**7. Утварыце словазлучэнні, ставячы назоўнікі ў патрэбнай форме, і запішыце іх. Прааналізуйце марфалагічнае выражэнне адушаўлёнасці – неадушаўлёнасці.**

Згадаць (маленства, русалка, хлопец), абшыць (людзі, моладзь, лялька, клоўн), чытаць (“Сымон-музыка”, кніга, раман), няма (цяля, лічынкі, дракон, туз, інфузорыя), чакаць (бабуля, атрад, карова, жанчына), слухаць (“Салавей”, палявод, студэнт, хлапчанё), есці (лешч, карп, хлеб, курыца), даглядаць (ласянё, голуб, кветкі), бачыць (зграя, чорт, ліпа).

**8. Выпішыце са сказаў рэчыўныя назоўнікі ў адзін слупок, а зборныя – у другі. Вызначце іх адметныя семантычныя і граматычныя прыметы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. А ў полі пастухі палілі бульбоўнік і пырнік і, калі асядала магутнае шыпучае полымя, пяклі ў прыску салодкую духавітую бульбу (Б.). 2. Пасля лістота пасыпалася з урвішча на дно яра (Каратк.). 3. Пясок на пляжы быў як прысак, аж падэшвы ног пёк (Саб.). 4. За жыты залатыя свой тост я ўзніму ды за песню, што згублена ў жыце (Гіл.). 5. Чалавечая душа не церпіць пустаты, і, калі яна не засяваецца разумным, добрым, высокім, там пачынае буяць пустазелле (З.П.). 6. Беларус любіць чорны хлеб і сумуе па ім, трапіўшы туды, дзе яго няма (Каратк.). 7. Ні па дварах, ні па прысадах вуліцу не пазнаеш, і прайсці нельга з-за рознага жалеззя, камення, бітай цэглы… (Кул.). 8. Аксеня была ў новай сукенцы з вішнёвага аксаміту (К.Ч.). 9. Знойдзена нафта на паўднёвым усходзе, ля вёскі Гарывада, дзе даўно заўважаны былі прыкметы "зямнога тлушчу" (Каратк.). 10. Вечарэла, і з палёў пахла збажынай, якая даспявала, налівалася, хілілася калоссем долу (Жук). 11. Цэлы дзень у пошуках дзічыны я блукаў аднойчы па тайзе (А.В.). 12. Вазі толькі збожжа на гумны, шуфлюй для бялейшага хлеба (У.Д.). 13. Лес скончыўся, і пачалося сухое балота з высокім куп'ём … (Шам.).

**9. Выпішыце назоўнікі, якія не з'яўляюцца зборнымі. Вызначце, чым адрозніваюцца такія назоўнікі ад зборных.**

Ламачча, лісце, садавіна, гай, калектыў, бяднота, сялянства, люд, зграя, куча, натоўп, апаратура, посуд, хлам, сасняк, полк, радня, дывізія, алешнік, рота, армія, студэнцтва, прафесура, група, моладзь, маліннік.

**10. Вызначце ў тэксце род назоўнікаў па лексічных, марфалагічных, сінтаксічных паказчыках.**

I. Чуў ад старых людзей, а нядаўна прачытаў у навукова-папулярнай кнізе, што буслы сваё хворае, нямоглае бусляня бязжаласна выкідаюць з гнязда.

Неразумна? Жорстка? А калі задумацца, то, можа, у гэтым ёсць і свая мудрасць. З кволага, слабага птушаняці не вырасце здаровая, моцная птушка, якая вытрымае далёкі пералёт. Значыць, яна асуджана на немінучую, пакутлівую гібель зімою.

Канечне, было б цудоўна, каб у кожным такім выпадку на дапамогу прыходзіў добры Айбаліт. Але ў рэальнай прыродзе дзейнічае іншы, больш суровы закон: выжывае мацнейшы. Прырода сама, стыхійна, клапоціцца пра сваю здаровую будучыню.

Сурова? Так. Справядліва? Наўрад ці. У першую чаргу для таго, хто нарадзіўся жыць.

З. Прыгодзіч.

II. І жэніцца і родзіць вёска слаба.
Гісторык з часам знойдзе веку штрых:
У кожнай хаце – толькі дзед і баба,
У кожным класе – толькі сем малых.

А помніцца: на школьны пляц-падворак
З адной сям'і нас бегла семярых …
Ці зразумее будучы гісторык,
Як мне ўпіваўся ў сэрца "веку штрых"?

Н. Гілевіч.

**11. Выпішыце са сказаў назоўнікі агульнага роду. Вызначце, асоб якога полу (мужчынскага ці жаночага) яны абазначаюць і якую маюць эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку.**

1. У няўмекі рукі калекі (Прык.). 2. Пайшоў наш дзядзька-небарака, на стол паказаны трапляе ды зноў там галаву скланяе … (К-с). 3. Гэта быў няўрымслівы непаседа, трапяткі і мітуслівы весялун (Віт.). 4. Дзед быў сведкам той вялікай справы, якую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачынала вёска гадоў пяцьдзясят таму (Каратк.). 5. Хоць часам сам не расчытаю, што напішу, -- такі пісака, -- не расчытае і сабака (К-с). 6. … Тут, пэўна, шворацца ваўкі і злыдні ходзяць, ваўкалакі … Папаўся ён тут, небарака! (К-с). 7. Моўчкі глядзіць беспрацоўны бадзяга на белакрылыя чайкі над морам (М.Т.). 8. Нават родныя бацькі папракалі сына хлебам пры абедзе за сталом. Ён – завала, ён – нязгрэба, ён радзіўся гультаём (К-с). 9. Звычайна к гэтаму часу ўставалі ўсе, апроч самых заядлых лежабокаў (К-с). 19 – Ну, і малайчына! Далі-бог, маладзец … Я, па праўдзе сказаць, і думаў, што ты павінен праведаць мяне … (К-с). 11. Адзін ён цяпер, сіраціна: ні маткі няма, ні сястры (К-с). 12. – Вы што зашыліся ў салому? Ўставайце зараз, гультаіны! Прайшло, лічы, ўжо дзве гадзіны, як сонца ў небе засвяціла, яны ж … хоць ты ўсадзі ім шыла! … (К-с).

**12. Ахарактарызуйце назоўнікі паводле іх родавай прыналежнасці. Адкажыце, чым вы кіраваліся пры гэтым? Падбярыце прыметнікі да назоўнікаў. Словазлучэнні запішыце.**

Камюніке, рэзюмэ, кашнэ, Душанбэ, алібі, канферансье, Токіа, Чылі, дэкальтэ, салямі, івасі, філе, кальрабі, фрау, ток-шоу, журы, дэндзі, міс, поні, какаду, цэцэ, сірока, місіс, парцье, мсье, кенгуру, гну, авеню, кулі, Ватерлоа, капрычыа, адажыа, Перу, Хакайда, жалюзі.

**13. Вызначце род складанаскарочаных слоў.**

НАН Беларусі, ВНУ, рыбгас, мясцкам, прафкам, інтэрпал, лясгас, ЗАТ, МАЗ, гарвыканкам, ЖЭС, ЛіМ, БелСЭ, БелТА, ТЮГ, СНД, прамкамбінат, БДПУ.

**14. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову, параўнайце род назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.**

Длинная шинель, красный гонт, ручная собака, неправильная дробь, большая мозоль, острая боль, старый комод, темная накипь, длинная тень, горькая полынь, черная бровь, правая туфля, глухая лесостепь, полная опись, дорожная пыль, лечебная валерьяна, неразборчивая запись, белый гусь, древняя летопись, большая охапка, широкая степь, густое какао, едкая гарь, сложный вопрос, ближайшая остановка, здоровый интерес, крупная фасоль.

**15. Замест кропак устаўце ў словах прапушчаныя літары і вызначце род звязаных з імі назоўнікаў. Дзеясловы стаўце ў форме прошлага часу.**

1. Рыбгас павіншава... работнікаў са святам. 2. На канферэнцыі выступі... малад... доктар Бондарава. 3. Гомельск... гарана арганізава... экскурсію ў Маскву. 4. ЛіМ змясці... цікавыя творы паэтаў. 5. ВАК зацвердзі... дысертацыю. 6. З дакладам выступі... нов... суддзя Галіна Мікалаеўна. 7. Міша – так... забіяка. 8. Наш... БАМ – наш гонар. 9. На вядом... БелАЗе працуе мой бацька. 10. Антарыа вядом... сваёй прыгажосцю. 11. Таццяна – кругл... сірата. 12. “Юманіте” выходзі... адзін раз на тыдзень.

**16. Выпішыце з тэксту назоўнікі з суадноснымі формамі адзіночнага і множнага ліку. Назавіце марфалагічныя сродкі выражэння ліку назоўнікаў.**

Друскенікі. Вялікі санаторны парк на беразе Нёмана. Куток жывой, клапатліва дагледжанай прыроды. Побач з выгоністымі соснамі, якія, пэўна, раслі тут спрадвеку, хораша падняліся пасаджаныя пазней бярозы, арабіны, каштаны, чаромха... .

Мноства птушак. Зяблікі, сініцы, чорныя дразды, шпакі не моўкнуць з ранку да вечара. І зусім не баяцца людзей. ... А вавёркі, дык тыя ўжо зусім ручныя. Варта толькі паклікаць: “Вера! Вера! ...” – і шустры рыжаваты камячок пушыстай маланкай імгненна сігае па ствале ўніз, за крок ад цябе ўзнімаецца на заднія лапкі і зіркае быстрым цікаўным вокам: “Ну, што там у цябе? Давай хутчэй ...”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шчаслівае, гарманічнае яднанне чалавека і прыроды. Няўжо нельга так зрабіць усюды?

З. Прыгодзіч.

**17. Утварыце формы множнага ліку і формы зборнасці ад наступных слоў.**

Прамень, бервяно, пяро, крыло, камень, ліст, корань, звер.

**18. Пастаўце назоўнікі ў форме множнага ліку.**

Дом, хата, гараджанін, вішня, курыца, цяля, мох, імя, чорт, неба, армянін, дзіця, дзяўчына, сусед, чалавек, воблака, стол, доктар, звон, шынель, племя.

**Прааналізуйце, якія афіксы выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні форм множнага ліку.**

**19. Выпішыце асобна назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным і толькі ў множным ліку. Размяжуйце гэтыя назоўнікі паміж лексіка-семантычнымі групамі.**

1. Яшчэ і цяпер высока накладзенае каменне, якое было пад ніжнім вянцом, не паспела ўтравець (Я.С.). 2. Як горды Эльбрус не апусціцца долу, ніколі не ўкленчаць народы Каўказа (Бр.). 3. Павыгарала трава ў парках. Толькі на газонах цвілі браткі ды астры (Асіп.). 4. Хай Нача серабрыцца між імшарын, злы лістабой не правіць хай дакоскі ... (В.З.). 5. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць (К.Ч.). 6. Увага ўсіх прысутных была скіравана на крыж з золата і срэбра (Каратк.). 7. Днём бабка пасадзіла дзяцей за стол і накарміла капустай і смажэнікамі з маладой бульбы (Вас.). 8. Пасля ўгодак – зноў музыка, ізноў у замку пышны баль (У.Д.). 9. Прыпяцкія берагі на шалі пясочныя паклалі хвалі апошняе веры (Р.Б.). 10. Ідуць бясконцым мураўіным гужам памераў парадыйных ішакі. Не то ў Кабул, не то да Гіндукуша вязуць яны славутыя **шаўкі** (Панч.). 11. Я падымаю галаву і бачу, як з граблямі на плячах да мяне падыходзіць Ганна (Скр.). 12. Пахлі рынкі горкім хрэнам і салёным **агурком**, мокрым лыкам, свежым сенам, кропам, сырам, малаком (Грах.). 13. Не ад мужа, а найперш ад свёкравай знявагі Зося яшчэ пазалетась сыходзіла ў прочкі...(Дал.). 14. Калёсы падскоквалі і грукацелі на пераплеценым у пяску карэнні дрэў (Хадк.). 15. Ездзілі ў Мінск караваны з ільном, збожжам, ...**птушкай** (Бяд.). 16. Усе **няшчасці** зваліліся ў адзін дзень (К-с). 17. Беларусь пастулова бяднела звярамі. ... Быў знішчаны **собаль**, **балотная рысь**, **чорны заяц** (Каратк.).

**Растлумачце асаблівасці выкарыстання катэгорыі ліку выдзеленых назоўнікаў.**

**20. Перакладзіце словы на беларускую мову, параўнайце лік назоўнікаў у рускай і беларускай мовах.**

Дверь, грудь, брусника, чернила, путы, конопля, крупа, соотношение, поведение, хитрость, дрова, совесть, хлопоты.

**21. Выпішыце з тэксту назоўнікі, групуючы іх па тыпах скланення. Вызначце склон і характар асновы гэтых назоўнікаў.**

Увесь вечар налятаў вецер, сыпаў снегам у твар, усё намагаўся насыпаць за каўнер. Пасмы снегу раз-пораз перабягалі цераз дарогу, праносіліся ў паветры перад вачыма – ад гэтага ўсё выглядала нерухлівым, неспакойным. Неспакойнае было і ў бегу коней, у няспынным дзікім варушэнні быльнягу абапал дарогі, на межах, у самім няроўным, кідкім ветры.

За белым поплавам дарога вывела да шляху. Па баках у шорсткім пошуме адна за адной пайшлі старыя бярозы. Вушы зноў востра лавілі гукі, сярод якіх супакойвалі толькі тупат і пырханне ззаду Апейкавых коней; вочы насцярожана сачылі за ценямі, за ўсякім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рухам. Бярозы за бярозамі з аднаго боку і з другога, і за кожнай можа чакаць небяспека. А тут злева насунуўся, узняўся чорнай сцяной лес.

Паводле І. Мележа.

**22. Выпішыце з тэксту назоўнікі 1-га скланення, вызначце іх склон і характар асновы. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў форме роднага, давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Растлумачце правапіс канчаткаў.**

I. Аднавілася, ажыла зямля.

Многагалосы, разнастайны паток жыцця залівае кожны шматок яе, поўніць лясы, поле, балоты і несціханым звонам калыша чуллівае празрыстае паветра. Адзеліся дрэвы ў новую зялёную вопратку, і такую паважную, поўную свайго мудрага сэнсу гутарку вядзе дрэва з дрэвам, лісток з лістком, а пад дрэвамі – былінка з былінкаю, а ў гэтых дрэвах пераклікаюцца птушкі, кузуркі, і іх галасы зліваюцца ў адну сімфонію дзівоснай музыкі жыцця.

Я. Колас.

II. Баравіна спадала ў нізінку, а там купчасціўся ўжо ягаднік. Яшчэ далей цёмная сцяна ялін прашыта была тонкімі ствaламі рэдкіх бярозак: да нізінкі неўпрыкмет падступала зацішнае ўрочышча. Тут, на самым краі светлай баравіны, было суха, цёпла ад зямлі, нагрэтай сонцам, густа ўсыпанай шорсткім шыгаллем і кволымі лусачкамі маладой сасновай кары. Седзячы, можна было доўга глядзець на неба, што свяцілася за калматымі хвоямі, любавацца ласкавым золатам высокіх ствалоў: адсюль, з зямлі, здавалася, што яны сыходзяцца ўгары.

М. Стральцоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**23. Падбярыце да рускіх словазлучэнняў беларускія адпаведнікі, запішыце іх. Адкажыце, ад чаго залежаць канчаткі назоўнікаў у давальным і месным склонах.**

Скучать по дочке, сидеть на меже, найти на земле, отзыв о няне, равнозначный черемхе, стоять на одной ноге, быть в обновке, шрам на щеке, надобность в верхней одежде, радоваться женщине, препятствовать воде, хлестать по груше, поехать к сестре.

**24. Выпішыце з тэксту назоўнікі 2-га скланення, вызначце іх склон і характар асновы. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў форме назоўнага, роднага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Растлумачце правапіс канчаткаў.**

Сцвярджае час: заўжды жыццю на змену
Прыходзіць смерць, для ўсіх – адзін закон,
І некалі жыццёвую арэну
Пакіне род людскі на схіле дзён.

Ты клічнік ставіш, час! А я – пытальнік:
А што, калі закон парушыць той
Мой слаўны род і вынайдзе – стваральнік –
Жывы бялок, што злучыцца з вадой

І дзікаватым племем неўміручым
Расселіцца па ўсіх мацерыках?
А што, калі мы жыць яго навучым,
Свет разумець, хадзіць на дзвюх нагах,
Перададзім сякеру – з рук у рукі,
Перададзім падручнік, а затым
Усе здабыткі працы і навукі?

… Час, паспрабуй тады спрачацца з ім!

А. Куляшоў.

**25. Пастаўце словы ў форме роднага склону адзіночнага ліку. Растлумачце правапіс канчаткаў.**

Прымус, узрост, чалавек, студзень, град, пясочак, паркаль, плуг, Мінск, сок, хлеб, твар, сад, Васіль, авёс, садок, квасок, суфікс, вальс, ідэал, усход, лоб, бокс, дождж, век, гераізм, айсберг, абеліск, хмызняк.

**26. Складзіце словазлучэнні ці невялікія сказы, каб кожнае мнагазначнае слова ў родным склоне адзіночнага ліку ўжывалася з канчаткам –у і –а.**

Народ, мухамор, завод, раз’езд, склад, дом, гук, лістапад, пад’езд, дагавор, парк.

**27. Пастаўце словы ў форме меснага склону адзіночнага ліку. Растлумачце правапіс канчаткаў.**

Мір, пень, пост (баявы), гай, кажух, дождж, цар, селянін, герой, стог, шлях, Мінск, Цімох, бібліятэкар, змрок, абавязак, рог (вуліцы), мост, баец, кірмаш, двор (калгасны), гасцінец, начлег, продаж, гарох, спіс, Міця, паверх, пост (рэлігійны), рог (жывёлы), двор (прастора), мех, лог, цень, строй, студыец, друкар.

**28. Выпішыце назоўнікі 3-га скланення, вызначце іх склон і характар асновы. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў форме творнага склону адзіночнага ліку.**

1. Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не гаснуць (Прык.). 2. Але ён і да гэтага часу быў перакананы, што калі збіралі рэчы, то разам з другімі хто-небудзь паклаў у катэр і яго стрэльбу (Я.М.). 3. Для выяўленчага мастацтва раманскага стылю былі характэрны прыкметны схематызм, сімвалічная абагульненасць, напружаная духоўная выразнасць, імкненне да выяўлення розных фантастычных істот (Э.Д.). 4. Пакуль у прадмесці ціха і немітусліва, ёсць магчымасць спакойна пахадзіць, падумаць, засяродзіцца, палюбавацца на шырокую роўнядзь Свіслачы (І.Д.). 5. Да пэўнай ступені бусел – сімвал Беларусі (Каратк.). 6. Азёры – вочы зямлі. Іх у нас каля 11 тысяч. Лясныя, як Кромань або Свіцязь, і бязлесныя (Каратк.). 7. У Нарачы, як і ў іншых азёрах і рэках Балтыйскага басейна, ад Брэста да Асвеі, водзіцца розная рыба (Каратк.). 8. Вялікія людзі нашчадкам у генах заўжды завяшчалі любоў (Е.Л.). 9. Ды пачуццё не думае пра вечнасць, калі агонь палае на губах (Бач.). 10. Любімых не забываюць у радасці, а ў горы любяць яшчэ мацней (Грах). 11. – Матка! А калі гэта да нас Шпак з будкі прыходзіў? – спытала адна маладзіца сваю свякроў, бабку Таццяну (К-с). 12. Адлучанасць ад шчасця – як праклён (В.А.).

**29. Запішыце назоўнікі ў форме давальнага і творнага склонаў. Вызначце асаблівасці іх скланення.**

Медзведзяня, імя, племя, ягня, ваявода, прамоўца, суддзя, Крапіва, ціхоня, запявала.

**30. Спішыце сказы, ставячы словы ў дужках у патрэбным склоне. Вызначце склонавую форму гэтых назоўнікаў.**

1. Самая балючая рана ад свайго (дзіця) (Прык.). 2. Гісторыкі звязваюць з (імя) Еўфрасінні полацкае летапісанне і збіранне бібліятэкі Сафійскага сабора (У.А.). 3. Рака Свіслач была (сведка) усёй амаль тысячагадовай гісторыі горада (І.Д.). 4. Нягледзячы на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тое, што ў 1997 годзе берасцейскім майстрам (Мікола) Кузьмічом быў узноўлены вобраз Крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, праблема пошукаў нацыянальнай рэліквіі застаецца па-ранейшаму актуальнай (У.А.). 5. Цяжка сказаць, з якімі думкамі пайшла тады Валя, але з (Сашка) яна пасля гэтага палагаднела (З.П.). 6. Брыгадзір не разгубіўся і моцным штуршком выбіў са (стрэмя) нагу (Б.). 7. Фіма Слуцкі падняўся (старшыня) насустрач (З.П.). 8. Воўк, відаць, меркаваў падысці рэчышчам пад калгасную абору, адкуль даносілася кволае бляянне (ягня) (Сам.). 9. Летам і ранняй восенню ненавязаны губаты пасвіўся з (цяля) на выгане, бегаў у лес паласавацца лісцем і карою (Дал.). 10. Рука яго больш у локці не згіналася, ён застаўся (калека) назаўсёды (К.Ч.). 11. Усе, хто шчыра сябраваў з (Вася) і хто зусім не сябраваў, маўчалі (Нях.). 12. Першы год вайны мы не разлучаліся з (Сеня) Пясоцкім (Шам.).

**31. Падбярыце па пяць геаграфічных назваў і прозвішчаў на –оў (-ёў), -аў (-еў), -ін (-ын). Пастаўце гэтыя назоўнікі ў форме давальнага і меснага склонаў, складзіце з імі словазлучэнні і запішыце іх. Растлумачце правапіс канчаткаў.**

**32. Спішыце сказы, ставячы назоўнікі ў патрэбным склоне. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў і абазначце склон.**

1. Пасля пайшоў снег, пасыпаўся, як з рэшата; раставаў на страсе ад скупога сонца, капаючы з доўгіх чысценькіх (ледзяшы) халоднымі (слёзы) (Пташ.). 2. Трава па (берагі) была акуратна скошана (Жук). 3. Навуку за (плечы) не насіць (Прык.). 4. Ідзі з (людзі) – то не згубішся (Прык.). 5. Уначы нешта не спалася, і я доўга ляжаў з адкрытымі (вочы), глядзеў праз акно на высокае цёмнае неба (З.П.). 6. Ён [Міхась Заранок] прыехаў з (канікулы) нейкі ўвесь размякла-шчаслівы і цяпер паволі вяртаецца ў шэрую прозу студэнцкіх (будні) (З.П.). 7. Праяўленне чалавечага духу ды інстынкту мэты штурхае пісьменніка на стварэнне (вобразы) неўміручых (героі) (Карп.). 8. У галерэі па (вечары) іграла музыка, наладжваліся танцы. Па (калядныя дні) паміж (дрэвы) развешваліся ліхтарыкі ілюмінацыі (А.А.). 9. Ў жыцці ёсць многа (злыя хвіліны), ды ў гэты час, у гэту пору (народныя песні) і (быліны) краса нам служыць за апору (Крыв.). 10. Стары Паўлюк, як ні было цяжка з (дровы), не рашыўся замахнуцца на бярозу (С.К.). 11. Па (ночы) яшчэ трашчаць вострыя маразы і шалёныя завірухі намятаюць снегу па самыя вокны (Дайл.). 12. Чырвоны певень з адмарожаным грэбенем і распухлымі (“завушніцы”) вылезе праз акенца з куратніка, спусціцца па (драбінкі) на двор, квола падымаючы то адну, то другую нагу, і, нязграбна залопаўшы (крылы), заспявае (Дайл.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**33. Выпішыце са сказаў назоўнікі, утвораныя з дапамогай афіксаў. Абазначце ў іх утваральную аснову і словаўтваральны фармант. Назавіце разнавіднасці афіксацыі.**

1. Альфа і амега сяброўства – спагадлівасць і надзейнасць (Г.М.). 2. Свайго найбольшага росквіту Полацк дасягнуў у XI стагоддзі пры князю Усяславе (У.А.). 3. Любоў да Беларусі нараджалася ў самыя галодныя, халодныя і цяжкія часы (Каратк.). 4. Вада Нарачы такая чыстая, што пры вялікай глыбіні можна бачыць усё, што ляжыць на дне (Каратк.). 5. Зычлівага чалавека ў няшчасці пазнаюць (Прык.). 6. Падмецены чыста падворак, ніякай нідзе пацярухі… (А.Р.). 7. А мой полудзень пад вязам – баль устроім, як паны! Там з суніцамі збаночак, сыру смачнага кусочак і грачанікі-бліны (К-с). 8. Смех дзявоча-пралескавы твой патануў у ясноце, ў надхмар’і (Я.П.). 9. Няхай гэта мне за шчасце счарсцвелага хлеба асушак, не згінуць каб, не прапасці ад прыкрае долі пастушшай (Віт.). 10. У добрага пільшчыка піла вострая (Прык.). 11. Невялічкія пагоркі з лапікамі маладых елак і бяроз пераходзяць у лясныя дзялянкі, дзе пераважаюць старыя хвоі (С.А.). 12. У няўмечкі не баляць ні ручкі, ні плечкі (Прык.).

**34. Прачытайце сказы і адкажыце, якім спосабам утварыліся выдзеленыя назоўнікі.**

1. У **Белавежы** мне шанцавала на цікавых людзей (Парх.). 2. З усіх музеяў, якія маюцца ў школах рэспублікі, самы цікавы, самы ўнікальны – Гудзевіцкі музей літаратурнага **краязнаўства** і **этнаграфіі**, што ў Мастоўскім раёне на Гродзеншчыне (Парх.) 3. Трынаццатага кастрычніка 1928 года была прынята пастанова **ЦВК** і **СНК** аб рэарганізацыі **Інбелкульта** ў Беларускую Акадэмію навук (Э.І.). 4. Ад **добрага** не ўцякай і **ліхога** не рабі (Прык.) 5. Наш **цеплаход** да самага прычала, шум перакрыўшы стомленых вінтоў, суправаджаў эскорт крыклівых чаек (Панч.). 6. Пакуль **дарослыя** насыпалі бульбу ў мяхі, насілі іх у машыну, хлапчукі тым часам корпаліся ціхенька на градках (З.П.). 7. На стэндах у музеі выстаўлены матэрыялы пра **Дуніна-Марцінкевіча**, Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча…(Парх.). 8. … Нарэшце, успаміны Паўліны Мядзёлкі, яе **фатаграфія**, ліст (Парх). 9. Давайце збудуем добрыя хаты заместа ракет, заместа гарматаў, давайце ж бальніцы, школы памножым, заместа знішчальнікаў і **бамбавозаў** (Бр.). 10. Было блізка ля **поўначы**. З неба глядзеў месяц (Каратк.). 11. Ля вуснаў тлеюць **самакруткі**, нібы бікфордавы шнуры…(С.З.). 12. Не хапае лапат дворнікам і – злосці. **Снегапад**. **Светлапад**. Маладое штосьці (Р.Б.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**35. Прачытайце тэкст. Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых назоўнікаў па наступнай схеме: 1) пачатковая форма; 2) лексіка-семантычная група; 3) лексіка-граматычная катэгорыя (канкрэтны ці абстрактны, уласны ці агульны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, зборны, рэчыўны, адзінкавы); 4) граматычныя катэгорыі (род, лік, склон); 5) скланенне; 6) сінтаксічная роля ў сказе.**

Вясна атуляе вячэрняй **сінечай** мяккія ў маладой зелені **беразнякі**. Поўная жыўнасці **лістота**, якая – дакраніся толькі -- ліпне да **рук**, неяк нясмела яшчэ, -- нібы сарамліва, як маладое **дзяўчо**, -- цягнецца насустрач сонцу, жыццю. Яна пахне ўсімі водарамі лесу пасля дажджу, і здаецца, што дыхае бярэзнік.

Пад вечнымі шаптухамі-пляткаркамі прыроды – **асінамі**, -- што пры дарозе, ляжаць яшчэ на траве ліпкія чашачкі ад гаючых вясновых пупышак дрэва; пахне разлітай настойкай бальзаму –тафялёўкай.

Адцвіла на **ўзлеску** сон-трава. Блакітная-блакітная ў маладосці, яна паліняла ўжо да белізны, падсохла на **сонцы**. Вельмі кароткая вясна для гэтых дзіў **узлесся**.

І. Пташнікаў.

**Заданні для самастойнай працы**

**1. Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс суфіксаў назоўнікаў. Выканайце марфемны разбор выдзеленых слоў.**

**Варыянт 1**

**Акра…ц**, **канькабеж…ц**, Сон…чка, дожджыч…к, **перашы…к**, дождж…к, вус…нь, дакла…чык, забойшч…к, Брэс…чына, Навагру…чына, Слу…чына, **сян…ік**, дзян…іца, грама…тва, **убо…тва**, Беласто…чына, **лясні…тва**, **свая…тва**, рэчан…ка, струмен…чык, вынахо…тва, рамен...чык.

**Варыянт 2**

**Кня…тва**, **тавары…тва**, **аген…тва**, сусе…тва, бе…тва, замоч…к, Браслаў…чына, рэкру…чына, Няме…чына, перабе…чык, **пераплё…чыца**, раке…чык, **шчэб…нь**, запарож…ц, карміл…ц, **карміл…ца**, **пта…тва**, Турэ…чына, салда…чына, ключ…к, малатабо…ц, твар…к, чарэшан…ка.

**2. Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс складаных назоўнікаў.**

**Варыянт 1**

Леанарда (да) Вінчы, Па (дэ) Кале, (обер) майстар, (экс) чэмпіён, (радыё) хваля, (паў) лімона, (контр) агент, (братка) брацейка, (мота) гонкі, (радые) лячэнне, (дзед) мароз, (Верхня) дзвінск, (гарна) лыжнік, (прэс) сакратар, (міні) матч, (Бялыніцкі) Біруля, (Жан) Жак Русо, (Сент) Экзюперы, (Верх) Ірмень, (праца) дзень, (кілават) гадзіна, (коне) завод, (чалавека) дзень, (Ніжня) вартаўск, (экс) прэм’ер, (стэрэа) кіно, (паў) аршына, (паст) фактум.

**Варыянт 2**

(Відэа) фільм, (паў) аршына, (паў) Слуцка, (контр) адмірал, (паст) пазіцыя, (супер) маркет, (двух) моўе, (мама) мамуся, (шум) гам, (вярці) шыйка, (перакаці) поле, (Нова) лукомль, (папараць) кветка, (прэм’ер) міністр, (радые) экалогія, (віцэ) прэм’ер, (штабс) капітан, (Буда) Кашалёва, Франфурт (на) Майне, Кёр (аглы), (Сан) Марына, (Усць) Каменагорск, Анарэ (дэ) Бальзак, Людвіг (ван) Бетховен, (медыка) псіхолаг, (норд) ост, (ільно) завод, (агра) хімія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ